ных слупоў Мечыславам I», «Арыстыд піша сам сабе загад на выгнанне», «Хрыстос перад Пілатам», «Напалеон на кані», партрэты (І.Закрэўскага, сям'і Манюшкаў, К.Сапегі, С.Солтана, А.Чартарыйскага, аўтапартрэт), пейзажы [у т.л. серыі краявідаў гарадоў Вільнюс, Віцебск, Ліда, Мінск, Магілёў, Нясвіж, Навагрудак, вёсак Любча Навагрудскага, Лошыца Мінскага (цяпер у межах горада), замка ў в. Смаляны Аршанскага р-наў] і інш.

**ПЕ́ШКУР** Іван Іванавіч (21.12.1921, в. Вострава Капыльскага р-на — 12.10.1980), беларускі мастак тэатра, жывапісец. Скончыў Віцебскае маст. вучылішча (1939). У 1944—57, 1970—80 працаваў у Дзярж. тэатры оперы і балета Беларусі, у 1957—70 — у Бел. рэсп. тэатры юнага гледача (з 1962 гал. мастак). Аформіў спектаклі «Чыа-Чыа-сан» Дж.Пучыні (1953), «Русалка» А.Даргамыжскага (1955), «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага (1956), «Папараць-кветка» (1957) і «Над хвалямі Серабранкі» (1961) І. Козела, «За лясамі дрымучымі» А.Вольскага і П.Макаля, «Не верце цішыні» І.Шамякіна (абодва 1958), «Дама-невідзімка» П.Кальдэрона (1964), «Чырвоная шапачка» Я.Шварца (1967), «Мядовы месяц» К.Губарэвіча (1970) і інш. Сярод жывапісных работ лірычныя пейзажы «Бярозы» (1960), «Крыжоўка» (1971), «Заслаўе» і «Курган Славы» (абодва 1972), «Рака Вяча» (1973), «Зімовыя далі» (1974) і інш., партрэты, акварэлі.

*І.Пешкур. Эскіз да оперы «Чыа-Чыа-сан». 1953.*



**ПІГУЛЕ́ЎСКІ** Мікалай Мікалаевіч (15.10.1897, в. Вялікае Падлессе Ляхавіцкага р-на — 16.3.1967), беларускі артыст оперы (лірыка-драм. барытон). Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1957). Скончыў БДУ (1925), Бел. студыю оперы і балета (1933). У 1920—24 артыст Бел. дзярж. тэатра. У 1933—35 і 1942—44 саліст Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі, у 1928—41 і 1944—48 — Бел. радыё. У Вял. Айч. вайну ў складзе франтавых канцэртных брыгад (разам з Л.Александроўскай, І.Жыновічам). У 1948—53 адказны рэдактар муз. вяшчання Бел. радыё. Выконваў гал. партыі ў операх рус. і замежных класікаў: Анегін, Ялецкі («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Грязны, Афрон («Царская нявеста», «Залаты пеўнік» М.Рымскага-Корсакава), Ігар Святаславіч («Князь Ігар» А.Барадзіна), Валянцін («Фауст» Ш.Гуно), Эскамільё («Кармэн» Ж.Бізэ), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні) і інш.



*М.М.Пігулеўскі.*

*С.У.Русецкі.*

**ПІЛІПА́ЎСКІЯ ПЕ́СНІ**, кудзельныя песні, прадзільныя песні, жанрава-тэматычная група песень, якія выконваліся падчас Піліпаўскага посту. Для іх характэрна сямейна-быт. тэматыка, калі свёкар («як бура гудзець») і свякруха («як каршун ляціць») папракаюць нявестку, што яна «санлівая, драмлівая, на работу лянівая, нявестачка наша». Тэма сац. няроўнасці знайшла адлюстраванне ў песні пра двух братоў, якія выказвалі розныя адносіны да багатай і беднай сястры падчас запрашэння на частаванне («За багатую сястрою на шасцёрачкі едуць, // За худою, бядною цераз людзі наказалі, // А багатую сястру на дарозе сустрэлі, // А худую, бядную на парозе не ўвайзналі»). Каб пераадолець цяжкасці манатоннай працы, жанчыны выконвалі жартоўныя песні, у якіх гумар увасабляўся пры дапамозе паэт. іранічна-гратэскавых сродкаў: «А наша Насцінька — ды тонкая праля, // Ды тонкая праля, ды звонкая ткаля: // Увадзіла ніткі пароўна калена, // Задумала Насцінька красёнкі ткаці, // Пайшла ў добры людзі бёрды дабываці...». Знайшла адлюстраванне ў П.п. і тэма кахання з яе перажываннямі, надзеямі («За што мяне друг не любіць?», «Селязень плаваіць», «Баліць мая й галовачка»).

*А.М.Ляхновіч.*

**ПІЛІПЕ́НКА** Міхаіл Фёдаравіч (н. 19.5.1936, в. Нежыхаў Брагінскага р-на), беларускі этнолаг. Чл.-кар. НАН Беларусі (1994). Засл. дзеяч культуры Беларусі (1999). Д-р гіст.